# НЕПРЕРЫВНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ В СИСТЕМЕ ПОДГОТОВКИ УЧИТЕЛЕЙ НАЧАЛЬНЫХ КЛАССОВ

## СУПРАЦОЎНІЦТВА ФАКУЛЬТЭТА І ШКОЛ ЯК ФАКТАР ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ ПРАФЕСІЙНА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

*Андарала А.І., кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск*

Анатацыя: у артыкуле разглядаюцца пытанні ўзмацнення практычнай накіраванасці прафесійнай адукацыі будучых настаўнікаў пачатковых класаў праз супрацоўніцтва факультэта і агульнаадукацыйных школ. Акцэнт зроблены на практыка-арыентаванай адукацыі, якая ажыццяўляецца ў працэсе бесперапыннай педагагічнай практыкі студэнтаў у школе.

*Ключавыя словы: падрыхтоўка настаўнікаў пачатковых класаў, пачатковая школа, практыка-арыентаваная адукацыя, супрацоўніцтва, бесперапынная педагагічная практыка студэнтаў.*

Узросшыя патрабаванні грамадства да асобы настаўніка паставілі перад педагагічнымі навучальнымі ўстановамі задачу ўдасканалення адукацыйнага працэсу на кампетэнтнаснай аснове шляхам узмацнення практычнай накіраванасці прафесійнай адукацыі.

У гэтай сувязі асаблівае значэнне набывае цеснае супрацоўніцтва факультэта пачатковай адукацыі са школамі. Яно выключна важнае для абодвух бакоў. З аднаго боку, выкладчыкі факультэта аказваюць настаўнікам малодшых класаў школ пастаянную навуковую і метадычную дапамогу па розных аспектах іх дзейнасці. З другога – цеснае супрацоўніцтва факультэта, кафедр са школамі, абагульненне і выкарыстанне выкладчыкамі ў вучэбнай рабоце са студэнтамі лепшага вопыту настаўнікаў з’яўляецца неабходнай умовай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Пастаянна сувязь і супрацоўніцтва факультэта і школ стала паўсядзённай нормай іх работы і ажыццяўляецца разнастайнымі метадамі і формамі. Асноўныя накірункі супрацоўніцтва: сумесная работа па ўдасканаленні зместу школьнай адукацыі; удзел выкладчыкаў факультэта ў павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы працуючых настаўнікаў; узаемадзеянне ў галіне ўзмацнення практычнай накіраванасці вучэбна-выхаваўчага працэсу на факультэце і іншыя.

У сукупнасці разнастайных форм і метадаў сумеснай дзейнасці факультэта і школ перш за ўсё трэба выдзеліць супрацоўніцтва па ўдасканаленні арганізацыі і правядзення педагагічнай практыкі студэнтаў.

Сёння фарміраванне ў студэнтаў факультэта пачатковай адукацыі прафесійнай гатоўнасці да работы ў школе ўключае не толькі авалоданне імі сістэмай спецыяльных і псіхолага-педагагічных ведаў, але і грунтоўную выпрацоўку такіх уменняў і навыкаў, без якіх немагчыма пасяховая педагагічная дзейнасць. Мы перакананы, што вялікую (калі не рашаючую) ролю ў фарміраванні прафесійных уменняў і навыкаў будучых настаўнікаў пачатковых класаў адыгрывае бесперапынная педагагічная практыка. Для максімальнага выкарыстання яе патэнцыялу ў фарміраванні прафесійнай кампетэнтнасці будучых настаўнікаў пачатковай школы на факультэце распрацавана і на працягу многіх гадоў выкарыстоўваецца мадэль праходжання комплекснай бесперапыннай пераемнай педагагічнай практыкі студэнтаў пачынаючы з першага па выпускны курсы [1].

Значэнне і задачы бесперапыннай педагагічнай практыкі ў школе шматгранныя: яна мае на мэце навучыць студэнтаў выкарыстоўваць у іх будучай дзейнасці тэарэтычныя веды, сфарміраваць уменні і навыкі, неабходныя для правядзення вучэбнай і выхаваўчай работы з малодшымі школьнікамі. У той жа час педагагічная практыка ў розных яе відах прызвана развіваць і замацоўваць цікавасць і схільнасць студэнтаў да педагагічнай прафесіі, стымуляваць далейшае паглыбленае вывучэнне імі спецыяльных і псіхолага-педагагічных вучэбных дысцыплін.

Асаблівасцю ўсіх відаў практыкі з’яўляецца тое, што яны арганізуюцца і праводзяцца кафедрамі факультэта ў самай цеснай сувязі са школамі. Для гэтага выкарыстоўваюцца разнастайныя формы ўдзелу настаўнікаў пачатковых класаў устаноў адукацыі ў правядзенні ўсіх відаў практыкі студэнтаў факультэта.

Асноўнымі функцыямі бесперапыннай комплекснай практыкі з’яўляюцца: навучальная (паглыбленне і прымяненне тэарэтычных ведаў, фарміраванне прафесійна-педагагічных уменняў і навыкаў); развіваючая (фарміраванне пазнавальнай творчай актыўнасці, прафесійна-педагагічнага мыслення); выхаваўчая (фарміраванне прафесійных якасцяў настаўніка пачатковых класаў, актыўнасці, перакананасці); дыягнастычная (праверка ўзроўню прафесійнай накіраванасці, прафесійнай падрыхтаванасці і здатнасці да педагагічнай дзейнасці).

Сістэма практычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў у школе ўключае паслядоўнасць наступных відаў практыкі: азнаямляльная (2 і 3 семестры); «Першыя дні дзіцяці ў школе» (5 семестр); вытворчая (6 і 7 семестры). Усе віды практыкі вырашаюць спецыфічныя для іх задачы і лагічна звязаны паміж сабой.

У адпаведнасці з вучэбным планам, першую азнаямляльную практыку студэнты-першакурснікі праходзяць на працягу аднаго тыдня на базе 1–4 класаў сярэдніх школ, гімназій, пачатковых школ г. Мінска пры непасрэдным

удзеле ў яе правядзенні настаўніка пачатковых класаў вучэбнай установы. Асноўнымі задачамі гэтага віду практыкі з'яўляюцца:

– замацаванне тэарэтычных ведаў па вучэбных дысцыплінах «Педагогіка пачатковага навучання» (раздзел «Агульныя асновы педагогікі»), «Псіхалогія пачатковага навучання» (раздзел «Агульная псіхалогія»);

– фарміраванне ўменняў аналізаваць стыль падагагічных зносін настаўніка, яго ацэначную дзейнасць;

– агульнае азнаямленне са зместам вучэбна-выхаваўчай работы ў пачатковых класах;

– развіццё ў студэнтаў арганізатарскіх і камунікатыўных уменняў.

Падчас практыкі студэнты штодзённа наведваюць урокі настаўніка, фіксуюць яго дзейнасць у дзённіку назірання, збіраюць матэрыялы для педагагічнай скарбонкі (узоры нагляднасці, раздатачны матэрыял і інш.), выконваюць заданні па педагогіцы і псіхалогіі.

Азнаямляльная практыка студэнтаў мае свой аднатыднёвы працяг у наступным – трэцім семестры. Другі этап практыкі прадугледжвае не толькі паглыбленне ведаў студэнтаў па тэорыі навучання і выхавання, псіхалогіі, але і фарміраванне пэўных практычных уменняў і навыкаў. У прыватнасці, аналізаваць вучэбныя праграмы і падручнікі на адпаведнасць педагагічным патрабаванням, вызначаць характэрныя асаблівасці розных тыпаў урокаў і ацэньваць эфектыўнасць арганізацыі дзейнасці вучняў на кожным этапе ўрока, аналізаваць мэтазгоднасць рэалізацыі дыдактычных прынцыпаў і прымянення метадаў навучання на ўроку, спосабы актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў, ажыццяўляць пратакольны запіс урокаў, арганізоўваць рухавыя гульні на перапынках і пазакласныя выхаваўчыя мерапрыемствы і інш.

Такім чынам, студэнты факультэта пры праходжанні азнаямляльнай практыкі пад непасрэдным метадычным кіраўніцтве настаўнікаў пачатковых класаў, якія замацаваны за імі, сустракаюцца з рэальнымі педагагічнымі сітуацыямі і формамі іх вырашэння. Знаёмства з шырокім спектрам абавязкаў будучай прафесійнай дзейнасці дапамагае канчаткова вызначыцца ў выбары педагагічнай прафесіі і спецыяльнасці.

Наступным відам педагагічнай практыкі студэнтаў факультэта пачатковай адукацыі з'яўляецца практыка «Першыя дні дзіцяці ў школе». У час гэтай практыкі (на працягу двух тыдняў) студэнты трэцяга курса назіраюць за дзейнасцю настаўніка па арганізацыі працэсу навучання ў першым класе, асаблівасцямі паводзін дзяцей шасцігадовага ўзросту ў першапачатковы перыяд навучання.

Асноўныя задачы гэтай практыкі:

– пазнаёміцца з асаблівасцямі, зместам і метадычнымі асновамі арганізацыі і ажыццяўлення вучэбна-выхаваўчай работы настаўніка з першакласнікамі ў курсе «Уводзіны ў школьнае жыццё»;

– усвядоміць змест работы настаўніка пачатковых класаў з бацькамі першакласнікаў у першыя дні іх навучання ў школе;

– навучыцца вызначаць узровень гатоўнасці дзяцей да навучання, іх адносіны да школы на аснове дыягнастычных даследаванняў.

У час практыкі студэнты наведваюць урокі і выхаваўчыя мерапрыемствы ў замацаваным класе, ажыццяўляюць іх аналіз, вывучаюць вучняў, школьную дакументацыю, прысутнічаюць на першым бацькоўскім сходзе, аказваюць дапамогу настаўніку ў правядзенні свята «Дзень ведаў» і інш.

На гэтым жа курсе, у наступным шостым семестры, студэнты праходзяць вытворчую практыку па спецыяльнасці. Яна з’яўляецца працягам вывучэння методык выкладання школьных прадметаў, праводзіцца пад кіраўніцтвам выкладчыкаў адпаведных вучэбных дысцыплін.

Мэтай практыкі, якая працягваецца пяць тыдняў, з’яўляецца ўдасканаленне ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі будучага настаўніка пачатковых класаў на аснове развіцця яго самастойнасці, адказнасці, актыўнасці, крэатыўнасці ў арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы з малодшымі школьнікамі.

Асноўныя задачы практыкі:

– замацаванне і паглыбленне псіхолага-педагагічных ведаў, усведамленне іх сувязі з практыкай навучання і выхавання;

– фарміраванне ўменняў выкладаць прадметы вучэбнага плана пачатковай школы;

– распрацоўка і выкарыстанне метадычнага забеспячэння вучэбнага працэсу ў пачатковай школе;

– падрыхтоўка да арганізацыі і правядзення пазакласнай дзейнасці з навучэнцамі;

– падрыхтоўка да правядзення педагагічных даследаванняў.

На працягу пяці тыдняў студэнты-практыканты маюць магчымасць праводзіць пробныя і заліковыя ўрокі па ўсіх прадметах пачатковай школы, пазакласныя выхаваўчыя мерапрыемствы.

Завяршаючым этапам у сістэме практык студэнтаў факультэта з’яўляецца пераддыпломная практыка. Асаблівасць педагагічнай практыкі на выпускным курсе заключаецца ў прадастаўленні студэнтам магчымасці самастойна арганізоўваць цэласны вучэбна-выхаваўчы працэс, праводзіць ўсе ўрокі, выхаваўчыя мерапрыемствы, узаемадзейнічаць з бацькамі навучэнцаў, далучаць іх да вучэбна-выхаваўчага працэсу, авалодваць ўменнямі навукова-педагагічнага даследавання ў галіне педагогікі і методыкі пачатковай адукацыі.

Першасныя абмеркаванні вынікаў кожнага віду практыкі, як правіла, праходзяць у навучальных установах (базах практыкі) з удзелам групавога кіраўніка, выкладчыкаў факультэта і настаўнікаў (непасрэдных кіраўнікоў практыкі).

Канчатковыя вынікі практык падводзяцца на факультэцкай канферэнцыі, якая з’яўляецца рэфлексіўным этапам. Яна, як правіла, праходзіць у нетрадыцыйнай форме – з мультымедыйнымі прэзентацыямі, фотавystава-

мі, што адлюстроўваюць найбольш яркія падзеі практыкі.

У час вытворчай і пераддыпломнай практык студэнтаў удзел у іх настаўнікаў пачатковых класаў і іншых педагагічных работнікаў школ становіцца больш значным. Настаўнік, які працуе з класам, за якім замацаваны практыкант, дапамагае яму ў планаванні работы, у падрыхтоўцы да ўрокаў і выхаваўчых мерапрыемстваў, прысутнічае і ўдзельнічае ў абмеркаванні пасля правядзення іх студэнтам. Перадаючы студэнтам свой багаты вопыт вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці, настаўнікі аказваюць непасрэдны ўплыў на фарміраванне ў іх прафесійна-педагагічных уменняў і навыкаў. У сваю чаргу, выкладчыкі факультэта, арганізуючы і праводзячы для настаўнікаў пачатковых класаў семінары і кансультацыі, на якіх знаёмяць з новымі даследаваннямі ў галіне методык выкладання, аказваюць ім дапамогу ў павышэнні педагагічнага майстэрства.

Трэба адзначыць, што факультэтам пачатковай адукацыі назапашаны істотны вопыт супрацоўніцтва са школамі ў арганізацыі і правядзенні бесперапыннай педагагічнай практыкі студэнтаў, склаліся пэўныя формы такога супрацоўніцтва. У той жа час, у гэтай справе яшчэ маецца значны патэнцыял.

**Спіс літаратуры**

1. Педагогические практики в начальной школе : пособие / Н. В. Жданович [и др.]; под ред. В. Г. Игнатович. – Минск : БГПУ, 2012. – 172 с.

## ТРАЕКТОРИИ КЛАСТЕРНОГО ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ В СИСТЕМЕ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ПОДГОТОВКИ БУДУЩЕГО УЧИТЕЛЯ

*Джерен Е.А.,*
*Рыбакова О.Н., магистр педагогических наук,*
*Полоцкий колледж учреждения образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова», г. Полоцк*

Аннотация. В статье на основе кластерного подхода рассмотрены возможности формирования регионального педагогического (образовательного) кластера. Представлены механизмы взаимодействия участников кластерной интеграции. Раскрывается сущность и особенности учебно-научно-инновационного кластера непрерывного педагогического образования.

*Ключевые слова: кластер, кластерное развитие непрерывного педагогического образования, взаимодействие.*

Кластер – совокупность территориально локализованных учреждений и организаций, взаимодействующих на основе соглашений и заинтересованных в инновационном развитии системы непрерывного педагогического образования [1].

Образовательный кластер представляет собой многоплановое и многообразное взаимодействие, воплощенное в различных видах деятельности.